N 007
15.09.2003 г.

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

02.09.2003. № 06-04/ 7352

На №

Вярхоўны Суд
Рэспублікі Беларусь
вул.Леніна, 28,
220681, г.Мінск

Ісцец: Міністэрства юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
вул.Калектарная, 10,
220004, г.Мінск

Адказчык: Грамадскае аб'яднанне
"Праваабарончы цэнтр
"Вясна"
Смаргоўскі праезд, д.3, кв.1
220053, г.Мінск

Іскавая заява

Аб ліквідацыі Грамадскага
аб'яднання "Праваабарончы
цэнтр "Вясна"

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікіі Беларусь зарэгістравана 15 чэрвеня 1999 года Грамадскае аб'яднанне "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (Пасведчанне аб рэгістрацыі № 00111).

У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" праведзена праверка адпаведнасці дзейнасці дадзенага грамадскага аб'яднання патрабаванням заканадаўства і Статута.

У ходзе праверкі ўстаноўлена, што пры рэгістрацыі дадзеным аб'яднаннем з боку яго заснавальнікаў дапушчаны парушэнні патрабаванняў артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", пункта 3 Палажэння, зацверджанага Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1999. №2, пункта 2 Правілаў, зацверджаных загадам Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 15.05.1995. №108.

У прыватнасці, аб'яднаннем прадстаўлены дакументы, не маючыя юрыдычнай сілы (пратакол Устаноўчага сходу заснавальнікаў аб'яднання, пратакол Устаноўчага сходу па стварэнню Брэсцкага аддзялення дадзенага

аб'яднання, спіс сябраў Рады, спіс сябраў Рэвізійнай камісіі, спіс ініцыятараў Віцебскага, Брэсцкага і Гомельскага аддзяленняў), бо ў азначаных дакументах маецца шэраг падробленых подпісаў.

Больш таго, пры рэгістрацыі аб'яднаннем не быў пацверджаны рэспубліканскі статус, чым не выкананы на той час патрабаванні рашэння Рэспубліканскай камісіі па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадскіх аб'яднанняў (Пратакол № 10/158/4 ад 24.03.1999.): не была пацверджана неабходная для дзяржаўнай рэгістрацыі наяўнасць заснавальнікаў адной з чатырох абласцей (па Магілеўскай вобласці прадстаўлена 8 чал. замест 10).

Пры праверцы аб'яднання ўстаноўлена, што на працягу сваёй дзейнасці неаднаразова парушаліся патрабаванні Статута (пункты 3.1, 4.5 і 5.1), і як следства патрабаванні артыкула 4 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях ", артыкула 48 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

А менавіта: прадугледжаная Статутам уплата членскіх узносаў не ажыццяўляецца, на тэрыторыі г.Мінска не створана арганізацыя (аддзяленне).

Таксама устаноўлены факт парушэння дадзеным аб'яднаннем патрабаванняў выбарчага заканадаўства ( маецца Пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарам і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 08.09.2001.).

Названым аб'яднаннем не выконваюццца патрабаванні артыкула 72 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, артыкула 22 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і пункта 2.1 Статута: у якасці грамадскага абаронца аб'яднанне звярталася ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь аб прадстаўленні і абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян, якія не з'яўляліся яго членамі.

Пры такіх абставінах і кіруючыся падпунктам 2 пункта 2 артыкула 57 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь і артыкулам 29 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" просім прыняць рашэнне аб ліквідацыі Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна".

Улічваючы, што Міністэрства юстыцыі ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2002 года вызвалена ад аплаты дзяржаўнай пошліны за падачу ў суд іскавых заяў, дакумент аб унясенні дзяржпошліны не прадстаўляецца.

Дадатак:

1. Копія Статута ГА "Праваабарончы цэнтр "Вясна" на 26 л. у 1 экз.;
2. Копія Пасведчання аб рэгістрацыі №00111 ад 15.06.1999г. на 1 л. у 1 экз.;
3. Копія заявы аб рэгістрацыі ад 15.09.1998 г. на 2 л. у 1 экз.;
4. Копія пратакола Ўстаноўчага сходу ад 20.06.1998 г. на 5 л. у 1 экз.;
5. Копія спісаў выбарных органаў на 2 л. у 1 экз.;
6. Копія пратакола Ўстаноўчага сходу па стварэнні Берасцейскага аддзялення на 2 л. у 1 экз.;
7. Копія пратакола Ўстаноўчага сходу па стварэнні Магілёўскага аддзялення на 1 л. у 1 экз.;
8. Копія пратакола Ўстаноўчага сходу па стварэнні Гомельскага аддзялення на 1 л. у 1 экз.;

9. Копія пратакола Ўстаноўчага сходу па стварэнні Віцебскага аддзялення на __2__ л. у 1 экз.;
10. Копія спіса ініцыятараў заснавання групы па стварэнню Віцебскага аддзялення на __2__ л. у 1 экз.;
11. Копія спіса сябраў Магілёўскага аддзялення на __1__ л. у 1 экз.;
12. Копія спіса сябраў Брэсцкага аддзялення на __1__ л. у 1 экз.;
13. Копія спіса сябраў Гомельскага аддзялення на __1__ л. у 1 экз.;
14. Копія спіса ініцыятараў стварэння (10 чал.) на __2__ л. у 1 экз.
15. Копія даведкі па выніках праверкі адпаведнасці дзейнасці ГА "Праваабарончы цэнтр "Вясна" на __2__ л. у 1 экз.;
16. Копія Пастановы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарам і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 08.09.2001 г. на __4__ л. у 1 экз.;
17. Копія пісьма Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 13.09.1999 г. на __1__ л. у 1 экз.
18. Копія пратакола пасяджэння Рэспубліканскай камісіі па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадскіх аб'яднанняў №10/158/4 ад 24.03.1999 г. на __1__ л. у 1 экз.

Міністр юстыцыі [подпіс] В.Р.Галаванаў

Фішкіна 223 27 93